# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

*З гісторыі беларускай дзяржаўнасці*

УДК 321+323.2

*М. А. Бяспалая*

## Станаўленне беларускай дзяржаўнасці: вытокі, умовы, формы

*Разглядаецца складаны працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці на этапе фарміравання нацыі. Падкрэслена роля партый, арганізацый, дзеячаў рознай палітычнай арыентацыі ў адстойванні беларускім народам права на самавызначэнне і месца нацыянальна-вызваленчага руху ў фарміраванні нацыянальнай інтэлігенцыі і ідэі.*

*Звернута ўвага на знакавыя падзеі на тэрыторыі Беларусі, якія садзейнічалі дэмакратызацыі грамадства.*

Драматызм сітуацыі, якая праявілася стагоддзе таму вакол праблемы самавызначэння беларускага народа і абрання формы яго дзяржаўнасці, на наш погляд, выразна акрэслівае яе характарыстыка як гістарычнай драмы ў трох дзеях: Заходняя камуна, БНР, ССРБ (БССР). Спробай аб'ектыўна раскрыць сутнасць падзей, якія разгарнуліся вакол абвяшчэння беларускай дзяржаўнасці ў 1918 г., былі ахоплены многія айчынныя навукоўцы як савецкага (напрыклад І. М. Ігнаценка, В. А. Круталевіч), так і постсавецкага (напрыклад У. М. Міхнюк, М. С. Сташкевіч і інш.) перыядаў. Стогадовыя юбілеі абвяшчэння БНР і ССРБ (БССР) выклікалі новую хвалю цікавасці да гэтага пытання, якая праявілася ў навуковых дыскусіях падчас канферэнцый, круглых сталоў, у шматлікіх публікацыях Р. Р. Лазько, В. Г. Мазеца, А. У. Унучака, С. С. Рудовіча і інш.

Вытокі сітуацыі, што склалася ў 1918 г., на наш погляд, бяруць свой пачатак у глыбокай даўніне і абумоўлены працэсам паланізацыі шляхты Вялікага Княства Літоўскага. На працягу стагоддзяў яна ўпарта адстойвала свае інтарэсы і прывілеі, якія былі б набліжаны да правоў польскай шляхты. Перад імкненнем ажыццявіць свае мэты адступалі дзяржаўныя інтарэсы, нівеліраваліся пачуцці любові і павагі да культуры і гісторыі народа, з улоння якога паходзіла шляхта. Менавіта змаганне за прывілеі стала адной з прычын такіх знакавых падзей у гісторыі нашай краіны, як заключэнне Люблінскай уніі (1569), якое адбылося пад ціскам дроб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най і сярэдняй шляхты, Контррэфармацыя, заключэнне Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г., пасля якой значная колькасць шляхты ў пагоні за абяцанымі прывілеямі перайшла з праваслаўя ва ўніяцтва, а потым, не атрымаўшы іх, стала актыўна далучацца да каталіцкай царквы.

Варта адзначыць, што ў гэты час большасць заходнееўрапейскіх краін канчаткова вызначылася са сваімі межамі, рэлігіяй. Адбываліся працэсы цэнтралізацыі дзяржаўнай улады, паступовай ліквідацыі прыгонніцтва, «уздыму» трэцяга саслоўя і інш. У Рэчы Паспалітай развіццё ішло ў адваротным кірунку: межы былі дастаткова ўмоўнымі, асабліва паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польскім каралеўствам; склаліся неаднародныя сітуацыі ў рэлігіі, ва ўмацаванні цэнтральнай улады; адбываўся працэс «другога выдання прыгоннага права», абмежавання эканамічных магчымасцей гараджан і г. д.

У канцы XVII ст. (1696) шляхта Вялікага Княства Літоўскага ў рэшце рэшт дамаглася ўраўнавання ў правах з кароннай шляхтай. У гэтым жа годзе быў зменены дзяржаўны статус беларускай мовы, у навучанні і маўленні пераважала польская мова. У выніку працэс паланізацыі шляхецкага саслоўя пайшоў хутчэй, чым раней, а асноўная маса насельніцтва – сялянства, аказалася пазбаўлена сваёй адукаванай і культурнай эліты.

На працягу ўсяго XVIII ст. цяжка знайсці праявы зараджэння беларускай ідэі, хаця выхаванцы з Вялікага Княства Літоўскага пакінулі значны след у еўрапейскай і польскай навуцы і культуры.

З пачаткам XIX ст. сярод этнічных супольнасцей Цэнтральнай Еўропы – венграў, чэхаў, славакаў – пад уплывам ідэй рамантызму, з іх патрыятычным зместам і ідэалізацыяй гістарычнага мінулага, абуджаліся нацыянальныя пачуцці, зараджаліся эліта і інтэлігенцыя, што абумовіла фарміраванне нацыянальных моў і літаратур, стварэнне музеяў як візуальнага доказу існавання і самабытнасці малых еўрапейскіх народаў.

У гэты час гаварыць аб абуджэнні беларускага этнасу не даводзіцца, хаця рэтраспектыўны падыход дазваляе нам выявіць першыя крокі на шляху нацыянальнага адраджэння. Яны былі зроблены «паповічамі» – выхадцамі з сем'яў уніяцкага духавенства на Беласточчыне, якая пасля падзелаў увайшла ў склад пратэстанцкай Прусіі. Мясцовыя ўніяцкія святары ўжывалі беларускую мову і захоўвалі народныя традыцыі. Некаторыя з «паповічаў», напрыклад І. Даніловіч, М. Баброўскі, атрымалі адукацыю, сталі прафесарамі Віленскага ўніверсітэта і зрабілі першыя захады на шляху пашырэння гістарычных ведаў, актуалізацыі ўвагі да мінулага Вялікага Княства Літоўскага, а тым самым да фарміравання беларускай ідэі [3]. Вучонымі былі знойдзены спіс беларуска-літоўскага летапісу, збор законаў Казіміра Ягелончыка (Статут 1468 г.), Супрасльскі кодэкс XI ст. – найстаражытнейшы помнік кірылічнага пісьменства, які ў 2007 г. быў уключаны ў рэестр міжнароднага праекта ЮНЕСКА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Помнікі сусвету». У цэлым было сабрана 2383 старажытныя дакументы [4, с. 2–3].

Даследчыкі адзначаюць своеасаблівы парытэт паміж уплывам польскай і рускай культур на грамадства беларускіх губерняў, які склаўся ў сярэдзіне XIX ст. У гэтых умовах у 1840-я гг. пачалася «першая хваля» беларускага адраджэння: з'явіліся друкаваныя творы на роднай мове, вывучаўся народны фальклор і інш. У рэчышчы вывучэння гістарычнага мінулага, галоўным чынам малой радзімы, у першай палове XIX ст. працавалі І. І. Грыгаровіч, Т. Нарбут, А. Кіркор, У. Сыракомля і інш. Шырока вядома дзейнасць братоў Канстанціна і Яўстафа Тышкевічаў, якія заклалі асновы айчыннай археалогіі і музеязнаўства. Па іх ініцыятыве былі заснаваны музеі старажытнасцей у радавым маёнтку ў Лагойску (1842) і ў Вільні (1855). Актыўны зварот да народнага фальклору, паданняў, легенд быў адзначаны сярод многіх літаратараў – З. Даленгі-Хадакоўскага, В. Каратынскага, А. Вярыгі-Дарэўскага, А. Міцкевіча, А. Рыпінскага, В. Дуніна-Марцінкевіча і інш. Так, прыгадваюцца радкі з верша В. Каратынскага «Туга на чужой старане», напісанага па-беларуску ў форме народнай песні. У вершы аўтар выказаўся ад імя паўстанцаў Каліноўскага, якіх выслалі на чужыну за барацьбу з царызмам, за ідэі незалежнасці.

Адарвалі сіраціну
ад сваёй зямлі,
Даўшы розум, хараміну,
Шчасця не далі…

Збіральніцкая і даследчыцкая праца аматараў і навукоўцаў першай паловы XIX ст. фактычна стварыла падмурак для далейшага вывучэння характэрных рыс беларускага этнасу, доказу самабытнасці яго культуры і этнагенезу. Вывучаючы мінулае беларускага краю, даследчыкі звярталі ўвагу на свае этнакультурныя карані, пранікаліся пачуццём павагі да багатай гісторыі і культуры народа.

Хаця ў першай палове XIX ст. нацыянальная ідэя яшчэ не аформілася, яна выспявала ў межах культурна-нацыянальнай працы. Другая палова стагоддзя дала пэўныя вынікі ў яе развіцці. З'явілася праграма Кастуся Каліноўскага, у якой упершыню было заяўлена аб праве на самавызначэнне палякаў, украінцаў, літоўцаў і беларусаў. Гэта было новае слова ў палітычнай думцы напярэдадні паўстання 1863–1864 гг., большасць удзельнікаў якога выступала за адраджэнне шматэтнічнай Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Гэта ідэя ўжо не адпавядала тагачасным агульнаеўрапейскім тэндэнцыям, калі многія народы сталі на шлях стварэння нацый. І наадварот, ідэя К. Каліноўскага ўпісвалася ў агульнаеўрапейскі кантэкст і суадносілася з імкненнямі многіх барацьбітоў за нацыянальнае адзінства, напрыклад Д. Гарыбальдзі ў Італіі і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ідэя аб праве на самавызначэнне стала галоўнай у справе фарміравання нацыянальнага руху і была падхоплена маладым пакаленнем. Аб гэтым сведчаць погляды студэнтаў-беларусаў Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта, выкладзеныя імі ў пачатку 1880-х гг. у артыкулах «Пісьмы пра Беларусь…», «Да беларускай моладзі», «Пасланне да землякоў-беларусаў», надрукаваных на старонках двух нумароў часопіса «Гоман». Аднак для актыўнага ўспрымання гэтай ідэі шырокімі коламі насельніцтва патрэбны былі адпаведныя ўмовы: наяўнасць нацыянальна арыентаванай інтэлігенцыі, эканамічная падтрымка яе дзейнасці, фарміраванне памяці аб адзіным гістарычным мінулым супольнасці, стварэнне літаратурнай беларускай мовы і інш.

Перыяд станаўлення беларускай нацыянальнай ідэі вызначаўся актыўнай і напружанай працай некалькіх пакаленняў нацыянальнай інтэлігенцыі, якая паступова фарміравалася са шляхецкага асяроддзя, чыноўніцтва, мяшчанства. Гэта быў працяглы па часе працэс, таму нацыянальнае абуджэнне народа адбывалася павольна. Найбольш актыўнай сілай беларускага нацыянальнага адраджэння выступалі прадстаўнікі дробнай шляхты. Падаецца, што першасным штуршком да ўсведамлення ёю сваёй аўтэнтычнасці з навакольным атачэннем – беларускамоўным сялянствам, паслужыў так званы разбор шляхты. Перавод значнай колькасці шляхецкіх сем’яў у разрад сялян-аднадворцаў у пэўнай ступені прымусіў іх збліжацца з суседзямі, уключыцца ў працэс сацыяльнай трансфармацыі.

Пад націскам расійскага эканамічнага, палітычнага і культурнага ўплыву, які ў Паўночна-Заходнім краі (назва беларуска-літоўскіх губерняў у адміністрацыйным справаводстве і публіцыстыцы) выразна праявіўся ў 70–90-я гг. XIX ст., польскае ўздзеянне вымушана адступіла. Некаторыя даследчыкі лічаць, што дадзеныя абставіны не дазволілі канчаткова паланізаваць мясцовае насельніцтва. Як трапна пісаў А. Цвікевіч, у гэты час пад вясковай страхой, у шляхецкім засценку ды ў старасвецкім панскім двары ў Беларусі паўсталі спрадвечныя пытанні аб тым, што значаць «тутэйшы край» і «тутэйшы народ» [5, с. 187]. Зараджэнне ідэі беларускай самабытнасці падтрымалі беларускія пісьменнікі, прадстаўнікі дробнай шляхты, Ф. Багушэвіч, Я. Неслухоўскі (Янка Лучына), І. Луцэвіч (Янка Купала) і інш. Фактычна ў гэты перыяд пачалася «другая хваля беларускага адраджэння».

Што датычыць шырокіх колаў мясцовай інтэлігенцыі, ім патрэбен быў час, каб стаць часткаю тутэйшай супольнасці, выпрацаваць літаратурную мову на базе народнай, стварыць розныя жанры літаратуры, вывучаць яе гісторыю, этнаграфію і фальклор і, самае галоўнае, папулярызаваць свае дасягненні сярод мясцовага насельніцтва.

Адной з найважнейшых умоў фарміравання нацыі з’яўляецца наяўнасць моцных і пастаянных эканамічных стасункаў паміж роз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ными рэгіёнамі пражывання этнасу. Найбольш выразным маркерам эканамічных працэсаў, што эфектыўна развіваюцца ў грамадстве, з'яўляецца рост гарадоў. У канцы другой паловы ХХ ст. у беларускіх губернях праяўляюцца прыкметы мадэрнізацыі, павялічваецца гарадское насельніцтва. Найбольшага развіцця гэтыя працэсы набылі ў гарадах, праз якія праходзіла чыгунка. Паводле этнаграфічнага складу гарадское насельніцтва пераважна прадстаўлялі яўрэі. З іх асяроддзя фарміравалася прамысловая і гандлёвая буржуазія, якая не праяўляла зацікаўленасці ў развіцці беларускага нацыянальнага руху. У выніку нацыянальны рух і ідэі адраджэння былі пазбаўлены моцнага эканамічнага падмурку. Патрэбных сродкаў на арганізацыю перыядычнага друку, выпуск літаратуры на беларускай мове, падтрымку нацыянальнага тэатра, мастацтва і іншага, можна сказаць, амаль што не было.

Другой моцнай эканамічнай сілай у беларускіх губернях, асабліва Мінскай і Гродзенскай, былі мясцовыя памешчыкі каталіцкага веравызнання. Яны прызнавалі роднай мовай польскую і лічылі сябе палякамі. Разам з тым некаторыя з іх, напрыклад Э. Вайніловіч, бачылі, што дастаткова значную частку польскіх землеўласнікаў Беларусі складалі аўтахтоны – шляхта мясцовага паходжання, якая раней прызнавала ўсходняе веравызнанне, а ў XVII ст. стала каталіцкай і апалячанай [1, с. 255]. Заўважым, што гэтае заключэнне Э. Вайніловіча ўзята за аснову сучаснымі беларускімі гісторыкамі пры характарыстыцы этнаканфесійнай эвалюцыі шляхецкага саслоўя.

Каб раскрыць адносіны шляхты да беларускага нацыянальнага руху, зноў спашлёмся на аўтарытэт Э. Вайніловіча. Ён сцвярджаў, што шляхта адчувала сябе адзінай з мясцовым насельніцтвам, ведала яго мову, звычаі, не імкнулася яго апалячыць і спачувала нацыянальнаму руху. Дарэчы, Э. Вайніловіч, дасканала ведаючы беларускую мову, пастаянна карыстаўся ёю ў зносінах з мясцовым насельніцтвам і быў «у пастаянным кантакце з усімі праявамі беларускага руху спачатку ў Мінску, <…> потым Вільні і Пецярбурзе…» [Там жа]. Аднак Э. Вайніловіч не ўваходзіў у беларускія аб'яднанні, якія падтрымліваў матэрыяльна, таму што іх дзейнасць, пачынаючыся з «самапазнання і нацыянальнага адраджэння, <…> звычайна ўрэшце набывала сацыялістычны накірунак», які не адпавядаў яго поглядам і з якім ён не мог пагадзіцца [Там жа, с. 255–256]. Нагадаем, што матэрыяльна падтрымлівалі беларускі нацыянальны рух Магдалена Радзівіл, Раман Скірмунт і інш.

На наш погляд, прыведзеная думка з успамінаў Э. Вайніловіча выразна акрэслівае прычыну адсутнасці адзінства беларускага нацыянальнага руху, які ў пачатку ХХ ст. быў палітызаваным пад уплывам эсэраў з іх праграмай сацыялізацыі зямлі, дэмакратычнай ідэяй, а затым сацыялістычнай Расійскай рэспублікі, што адбілася нават у змене назвы партыі – Беларуская дэмакратычная, а потым сацыялістычная грамада.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Знакавай падзеяй на шляху афармлення нацыянальнай ідэі стала стварэнне першай беларускай нацыянальнай партыі – *Беларускай дэмакратычнай (сацыялістычнай) грамады* – і распрацоўка яе праграмы, якая адпавядала інтарэсам не толькі тытульнага этнасу, але і іншых этнічных груп, што пражывалі ў беларускіх губернях. Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ) выступала за культурна-нацыянальную аўтаномію Беларусі з сеймам у Вільні ў складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі. Гэтая ідэя пэўны час з'яўлялася прывабнай для дэмакратычных плыняў беларускага нацыянальнага руху. Адначасова ўзнік праект аўтаноміі беларускіх і літоўскіх зямель у межах Расійскай дзяржавы, так званая ідэя «краёвасці», блізкая да планаў адраджэння Вялікага Княства Літоўскага. Ініцыятарамі яе сталі Р. і К. Скірмунты, М. Ромер і інш. Аднак яна не вытрымала выпрабаванне тагачасных палітычных рэалій, абумоўленых актывізацыяй літоўскага нацыянальнага руху і негатыўным стаўленнем прадстаўнікоў польскага руху.

Неабходна звярнуць увагу, што пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг. і з пачаткам Першай сусветнай вайны сацыяльная база беларускага нацыянальнага руху значна пашырылася. Да яго пачалі далучацца рабочыя-беларусы, якія працавалі ў многіх гарадах Расіі, асабліва з Санкт-Пецярбурга і Масквы. Як прыклад можна назваць супрацоўніцтва з беларускімі студэнцкімі суполкамі Санкт-Пецярбурга маладога рабочага-фрэзероўшчыка, будучага вядомага паэта, дзяржаўнага дзеяча З. Жылуновіча (Цішка Гартны). У гады Першай сусветнай вайны вайскоўцы-беларусы (напрыклад А. Р. Чарвякоў) і тысячы бежанцаў далучыліся да беларускага вызваленчага руху.

Падтрымліваючы ідэі бальшавікоў у нацыянальным пытанні і пераадольваючы супраціўленне цэнтральнай і мясцовай бальшавіцкай улады, дэмакратычны рух (нацыянальныя дэмакраты) пэўным чынам спрабаваў ажыццявіць сваю мэту, абвясціўшы Беларускую Народную Рэспубліку (БНР) і яе суверэнітэт.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. нацыянальны рух на неакупіраванай немцамі тэрыторыі значна актывізаваўся і ахапіў шырокія колы мясцовай інтэлігенцыі, заможных станаў насельніцтва, духавенства, якія імкнуліся выпрацаваць адзіную палітычную лінію. 25–27 сакавіка 1917 г. у Мінску адбыўся з'езд беларускіх арганізацый, на ім прысутнічала каля 150 дэлегатаў ад розных аб'яднанняў, пераважна з Петраграда, іншых расійскіх гарадоў, а таксама Магілёва, Оршы, Віцебска і інш. Актыўную ролю ў скліканні з'езда і яго рабоце адыграў Мінскі камітэт дапамогі ахвярам вайны на чале з чыноўнікам Лібава-Роменскай чыгункі У. Фальскім. У дні работы з'езда аднавіла легальную дзейнасць БСГ.

Дэлегаты з'езда паслалі прывітальныя тэлеграмы Часоваму ўраду, Петраградскаму савету, салдатам-беларусам і інш. Для падрыхтоўкі выніковага дакумента з'езда было створана сем камісій, старшыні якіх на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чарговых пасяджэннях агучвалі распрацаваныя прапановы. Галоўная і вызначальная – гэта дзяржаўна-тэрытарыяльнае будаўніцтва Беларусі як аўтаноміі ў складзе будучай Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі. Дакладныя этнаграфічныя межы павінна была вызначыць спецыяльная камісія ў складзе прафесараў М. Любаўскага і М. Доўнар-Запольскага, акадэмікаў Я. Карскага і А. Шахматава. Ядром рассялення беларускага народа з'езд палічыў Мінскую, Віцебскую, Гродзенскую, Магілёўскую, часткі Чарнігаўскай і Смаленскай губерняў. З абурэннем дэлегаты аднесліся да спробы Літоўскага нацыянальнага камітэта дабіцца ад Часовага ўрада перадачы яму ўсёй Віленскай губерні, якая на тры чвэрці была заселена беларусамі.

З'езд абраў *Беларускі нацыянальны камітэт* (БНК) з 18 чалавек і яго прэзідыум як выканаўчы орган. Узначаліў БНК Р. А. Скірмунт. Задачай БНК з'яўлялася арганізацыя сумесна з Часовым урадам барацьбы са знешнім ворагам, стварэнне арганізацыйных структур Беларусі. Аб рашэннях з'езда Часоваму ўраду павінна была паведаміць дэлегацыя на чале з Р. А. Скірмунтам, аднак яна не была прынята кіраўніцтвам урада.

Пасля з'езда былі створаны беларускія партыі разнастайнага кірунку: *народных сацыялістаў*, *хрысціянска-дэмакратычная*, *народнай грамады* і інш. Адначасова пашыралася дзейнасць беларускага руху: створаны культурна-асветныя, літаратурныя, тэатральныя гурткі, аб'яднанні і г. д. Яны ўзнікалі сярод беларусаў-бежанцаў, у войску, на тэрыторыі неакупіраваных усходніх губерняў. У чэрвені 1917 г. у Петраградзе адбылася канферэнцыя БСГ, на якой быў абраны Цэнтральны камітэт на чале з Ц. Гартным (З. Жылуновічам). Беларускія партыі дасягнулі адзінства ў вырашэнні галоўных задач: *аўтаномія Беларусі*, *свабоднае развіццё беларускай мовы і культуры*. Аднак Часовы ўрад адмоўна паставіўся да гэтых патрабаванняў, таму што яго мэтай заставалася адзіная і непадзельная Расія. Не праяўляла вялікай зацікаўленасці да нацыянальнага пытання і беларускае сялянства, заклапочанае рашэннем сваіх надзённых праблем.

У сувязі з малаэфектыўнай дзейнасцю Беларускага нацыянальнага камітэта і ва ўмовах ліпеньскага палітычнага крызісу (8–10 ліпеня 1917 г.) у Мінску адбыўся новы з'езд беларускіх арганізацый і партый. Яго рашэнні адпавядалі праграме, выпрацаванай папярэднім з'ездам, аднак БНК быў заменены новым органам – *Цэнтральнай радай беларускіх арганізацый* (ЦРБА). У яе склад увайшлі толькі прадстаўнікі БСГ, фактычным кіраўніком быў А. Смоліч. У канцы кастрычніка 1917 г. ЦРБА была рэарганізавана ў *Вялікую беларускую раду* (ВБР). Амаль адначасова на з'ездзе беларусаў-вайскоўцаў была арганізавана *Цэнтральная беларуская вайсковая рада*. Яе задачай з'яўлялася фарміраванне беларускага войска. У лістападзе 1917 г. былі створаны беларускі полк у Мінску і конны эскадрон пад Оршай.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак складаная ўнутрыпалітычная сітуацыя летам 1917 г. аказала негатыўны ўплыў на развіццё нацыянальнага руху. Гэта выразна праявілася ў пазіцыі найстарэйшай і найбуйнейшай (каля 10 тысяч членаў) нацыянальнай партыі – БСГ. У верасні 1917 г. адбыўся яе першы раскол, у выніку левая плынь арганізавала *Беларускую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю* (БСДРП) на чале з А. Чарвяковым і З. Жылуновічам. Яе назва выразна адлюстроўвала арыентацыю БСДРП на праграму РСДРП (бальшавікоў).

Аб'ектыўныя абставіны, такія як адсутнасць нацыянальнай буржуазіі, а значыць эканамічнай падтрымкі, нешматлікасць і слабасць сярэдняга класа, з якога паходзіла нацыянальна свядомая інтэлігенцыя, адсутнасць шырокай падтрымкі нацыянальнай ідэі сялянскай супольнасцю, вымушалі дзеячаў нацыянальнага руху выпрацоўваць адмысловую тактыку. На жаль, адзінага падыходу вызначыць не змаглі. Прадстаўнікі адной плыні лічылі, што патрэбна штодзённая ўпартая праца, накіраваная на пашырэнне нацыянальнай свядомасці, асветы і культуры, сельскагаспадарчых ведаў і г. д., каб стварыць трывалы эканамічны і культурны падмурак будучай нацыянальнай незалежнасці. Прадстаўнікі другой плыні рашуча выступалі за абвяшчэнне беларускай дзяржавы неадкладна, пасля чаго планавалі пачаць працу над культурным, нацыянальным, эканамічным адраджэннем. Да вясны 1918 г. у лідараў беларускага нацыянальнага руху, якія дзейнічалі на неакупіраванай немцамі тэрыторыі Беларусі, галоўнай мэтай заставалася дасягненне аўтаноміі Беларусі ў складзе дэмакратычнай Расійскай рэспублікі.

Некалькі іншай тактыкі прытрымліваліся беларускія дзеячы на чале з братамі І. і А. Луцкевічамі ў акупіраванай немцамі Вільні. Яны вылучалі ідэю адраджэння уніі Беларусі і Літвы, але ў гэты час ужо актыўна дзейнічалі нацыянальныя рухі – літоўскі, польскі, яўрэйскі, набіраў сілу беларускі. Народы, якія імкнуліся да нацыянальных утварэнняў, ужо было немагчыма аб'яднаць у адзінай дзяржаве. Апіраючыся на падтрымку нямецкіх акупацыйных улад віленскія беларусы актывізавалі беларускую культурна-асветніцкую работу: выдавалі газету «Гоман», дзейнічалі навукова-культурныя таварыствы, рабіліся захады па стварэнні беларускага музея і інш. [2, с. 10–14].

Такім чынам, працэс узнікнення беларускай нацыі ішоў марудна па розных прычынах: па-першае, павольна фарміравалася нацыянальная інтэлігенцыя з асяроддзя небагатай шляхты; па-другое, адсутнічала эканамічная падтрымка нацыянальнага руху; па-трэцяе, існавалі супрацьлеглыя ідэйна-палітычныя і навуковыя падыходы да пытання аб этнічнай прыналежнасці беларусаў і іх гістарычнага шляху; па-чацвёртае, ён не пазбегнуў моцнай палітычнай інверсіі, што прывяло да яго расколу. Нягледзячы на пазначаныя акалічнасці нацыянальная ідэя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

была аформлена ў праграме БСГ, папулярызавалася ў беларускім перыядычным друку, найперш у «Нашай ніве».

Ужо перад Першай сусветнай вайной назіраўся працэс актывізацыі беларускага нацыянальнага руху, аб чым сведчыла дзейнасць партыі і напісанне яе праграмы, рост самасвядомасці нацыянальнай інтэлігенцыі, стварэнне твораў на беларускай мове, з'яўленне першых выданняў па гісторыі Беларусі. Пытанне аб дзяржаўнай форме нацыянальнага самавызначэння беларусаў стала цэнтральнай праблемай грамадска-палітычнага жыцця пасля рэвалюцыйных падзей у лютым 1917 г.

1. *Войнилович, Э. А.* Воспоминания : пер. с пол. / Эдвард Войнилович. – Минск : Минская римско-катол. епархия св. Симона и Елены, 2007. – 379 с.

2. *Луцкевіч, А. І.* Дваццаць пяць гадоў (1903–1928): Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый: Беларуская рэвалюцыйная грамада, Беларуская сацыялістычная грамада / А. І. Луцкевіч. – Мінск, 1991. – С. 3–40.

3. *Марозаў, С. П.* Грамадска-палітычны рух у Беларусі за адраджэнне Вялікага Княства Літоўскага (канец XVIII – першая чвэрць XX ст.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / С. П. Марозаў ; БДПУ. – Мінск, 2016. – 28 с.

4. *Пустаход, Т. С.* Навукова-педагагічная і асветніцкая дзейнасць М. К. Баброўскага (1784–1848 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Т. С. Пустаход. – Мінск, 2017. – 152 с.

5. *Цьвікевіч, А.* «Западно-русизм»: нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. / А. Цьвікевіч. – 2-е выд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.

*M. Byaspalaya*

**Formation of the Belarusian statehood: origins, conditions, forms**

*The complex process of formation of the Belarusian statehood at the stage of a nation's formation is considered. The role of parties, organizations, figures of various political orientations in defending the right of the Belarusian people to self-determination and the place of the national liberation movement in the formation of national intelligence and idea is emphasized.*

*The attention to the significant events on the territory of Belarus which contributed to the democratization of society is drawn.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 11.10.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ